View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE



**УДК 392.1(476)“18/20”**

# ПАМІНАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ Ў ВЕСНАВЫ ПЕРЫЯД (ПА ЭТНАГРАФІЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАХ XIX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ)[1]

***канд. гіст. навук У.Я. АЎСЕЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*На аснове этнаграфічных матэрыялаў XIX – пачатку XXI стагоддзя разгледжана памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння ў веснавы перыяд. Прааналізаваны памінальныя традыцыі на Масленічныя і Вербныя Дзяды, велікодна-радаўніцкія і траецкія абрады ўшанавання продкаў. Дадзена характарыстыка варыянтам назваў абрадаў, выяўлены іх арэалы, разгледжаны парадак рытуальных дзеянняў, ахарактарызаваны сучасны стан абрадаў, выяўлены іх рэгіянальныя рысы і лакальныя адрозненні ў межах Падзвіння. Да этналагічнага вывучэння прыцягнуты новыя палявыя матэрыялы, частка якіх зафіксавана аўтарам. Вынікі даследавання будуць карыснымі як для вывучэння светапогляду і вераванняў беларусаў, так і для вырашэння праблем этнічнай гісторыі рэгіёна.*

**Уводзіны.** Адной з важнейшых задач беларускай этналогіі з’яўляецца ўсебаковае вывучэнне рытуальных аспектаў жыццядзейнасці беларускага этнасу, у тым ліку пахавальна-памінальнай абраднасці. Яна з’яўляецца найбольш устойлівай і кансерватыўнай часткай культуры, а таму больш трывала захоўвае этнічную спецыфіку. Пахавальныя і памінальныя абрады надзвычай інфармацыйныя, вельмі важныя для вывучэння этнічных працэсаў. Яны дазваляюць выявіць узаемасувязі абрадавых комплексаў сямейнага і каляндарнага цыклаў на розных этапах развіцця этнасу. Даследаванне пахавальна-памінальнай абраднасці садзейнічае разуменню іншых праяў самабытнай духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў.

Пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў не з’яўляецца аднароднай на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У розных рэгіёнах краіны гэта частка культуры мае свае асаблівасці, што робіць актуальным правядзенне спецыяльных арэальных этналагічных даследаванняў. Кожная лакальная традыцыя фарміруецца пад уздзеяннем шэрагу фактараў – прыродна-геаграфічных, гістарычных, дзяржаўна-палітычных, сацыяльна-эканамічных і інш. Немалаважную ролю сярод іх адыгрываюць уласна этнічныя працэсы. Вывучэнне лакальных комплексаў культуры і асобных яе кампанентаў дазваляе лепш зразумець асаблівасці этнічнай гісторыі ў канкрэтным рэгіёне. Улічваючы кансерватыўнасць пахавальна-памінальнай абраднасці, яна дае надзвычай важную інфармацыю для даследавання этнічных працэсаў на Падзвінні.

У артыкуле прадстаўлены аналіз памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння ў веснавы перыяд, які з’яўляецца адным з найбольш адметных, багатых і разнастайных цыклаў народнага календара.

**Асноўная частка.** У даследчыкаў няма адзінага меркавання адносна пачатку і заканчэння веснавога цыкла каляндарных абрадаў у беларусаў. Найбольш аргументаванай выглядае версія А.С. Ліса, згодна з якой веснавы цыкл распачынаецца з Аўдакеі (Еўдакія), а заканчваецца Русальным тыднем. Пры гэтым даследчык адзначае, што абрадам веснавога цыкла папярэднічаў Масленічны тыдзень. Па сваёй скіраванасці Масленічная абраднасць можа быць аднесена да веснавога перыяду [1, с. 169, 170]. Версіі адносна суаднясення абрадаў на Масленіцу з веснавым цыклам прытрымліваюцца і іншыя даследчыкі [2, с. 11; 3, с. 70; 4, с. 24]. У такім выпадку памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння ў веснавы перыяд уключае Масленічныя Дзяды, велікодна-радаўніцкія і траецкія памінальныя абрады, а таксама традыцыі ўшанавання продкаў на Вербніцу.

**Масленічныя Дзяды.** Згодна з праваслаўным календаром, масленічнаму тыдню папярэднічае адна з «радзіцельскіх субот». У шэрагу частак Беларусі да яе прымеркавана спраўленне Дзядоў. Дадзеная памінальная традыцыя распаўсюджана на Падзвінні, Падняпроўі і Усходнім Палессі [5, с. 81, с. 82; 6, с. 179; 7, с. 65]. Яна спарадычна сустракаецца і на Міншчыне [8, с. 114]. На Брэсцкім Палессі і Панямонні Масленічныя Дзяды амаль не фіксуюцца [9, с. 82; 10, с. 27, 95]. На Падзвінні дадзеная памінальная традыцыя найбольш пашырана ва ўсходняй частцы рэгіёна (мал. 1). Яна спарадычна сустракаецца і ў цэнтральнай, вельмі рэдка на захадзе рэгіёна (за выключэннем Докшыччыны).

На Падзвінні Дзяды, якія адзначаюцца напярэдадні Масленіцы, маюць розныя назвы. Найбольш распаўсюджанымі з’яўляюцца назвы «*Масленічныя*», ці «*Масленыя*», Дзяды. У рэгіёне гэтыя Дзяды сустракаліся таксама пад назвай «*Мясаедныя*», а памінальная субота мела назву «*Тоўстай*» [11, с. 2; 7, с. 65]. Этнограф М. Анімеле адзначаў, што ў Лепельскім павеце гэтыя Дзяды былі вядомыя пад назвай «*Мясныя*»

---

[1] Артыкул падрыхтаваны ў ходзе працы па тэме «Традыцыйны культурна-моўны ландшафт беларуска-рускага (Віцебска-Смаленскага) памежжа ХХ – пачатку ХХІ ст: сімволіка фальклорных вобразаў, рытуальныя функцыі і іх камунікатыўныя рэпрэзентацыі» (Г14РП-003).

[45, с. 212]. У вёсцы Гняздзілава (сучасны Докшыцкі раён) яны мелі назву «*Мясніцы*» [12, с. 258]. Падобная назва і ў сучасны перыяд фіксуецца ў вёсцы Туркі Докшыцкага раёна: «*Дзяды тры разы: перад акцябарскімі – Дзмітраўскія, Асяніны, перад Велікодным постам Мясніцы і перад Тройцай*»[1].




Мал. 1. Арэал абраду Масленічныя Дзяды на тэрыторыі Беларускага Падзвіння

Этнографы канца XIX – пачатку XX стагоддзя амаль не зафіксавалі на Падзвінні прынцыповых асаблівасцей у памінанні памерлых на Масленічныя Дзяды ў параўнанні з іншымі Дзядамі[2]. У вёсцы Гняздзілава (сучасны Докшыцкі раён) на гэта свята пасля вячэры ўся моладзь адпраўлялася ў шынкі на ігрышча [12, с. 258]. Спецыфічнай рысай Масленічных Дзядоў з'яўляецца прыгатаванне для памінальнай трапезы бліноў [7, с. 65]. Рэспандэнты паведамляюць таксама аб прыгатаванні «масленых» страў: «*Адзначалі Масляныя Дзяды – гатавалі ўсё масляное*»[3]. У шэрагу месцаў рэгіёна існавалі некаторыя асаблівасці ў асартыменце страў і парадку іх спажывання. Так, у вёсцы Рамашкава Талачынскага раёна быў наступны парадак: «*Масляныя, ці ня чэцьвера іх. Пякуць первы блін, эта ўсегда пакойніку. І такі канун робюць, мёду туды нямножка. А вечарам эты блін, што первы, нада ў гэту ваду пакрышыць. І браць ложкай. Первую ложку ўзяць і паліць пакойніку. На стол паліць і палажыць. Тады браць сабе ў рот. Тады апяць. На стол трошку і сабе ў рот. Тры разы так. – Не абязацельна так. Наша мама і звала: "Дзяды-прадзеды, хадзіця к нашаму столу, к нашаму паспеху, хлеба-солі прыяйце, нас ня скора ажыдайця". Возьмеш тарэлачку, паложаш яму на тарэлачку бліна, чаго яшчо і нясуць на кут пад іконы. А тады самі за стол садзімся. А тоя там стаіць. Усіх памянеш. Усе родненькія, хадзіця ... і завіця ўсіх, у каго німа. Усіх, усіх. Я і цяпер усіх памінаю, людцы добранькія, і сватоў, усіх, і па імю назаву, прыхадзіця ўсе*»[4]. У астатніх момантах памінальныя абрады на Масленічныя Дзяды, як сведчаць матэрыялы сучасных палявых даследаванняў, амаль не адрозніваюцца ад іншых Дзядоў.

У мясцовасці паблізу пасёлка Бягомль Докшыцкага раёна Дзяды напярэдадні Масленіцы атрымалі назву «*Буркаўскія*» [14, с. 55; 15, р. 29, 30–31, 36, 75–76 79]. На тэрыторыі мікрарэгіёна існуюць разыходжанні як у тлумачэнні тэрміна, так і адносна абрадавых дзеянняў падчас гэтых Дзядоў. У рэгіёне слова «буркаўкі» мае таксама значэнне свіных ножак, прыгатаваных для рытуальнага спажывання, вырабленых з іх дзіцячых забавак, калі костачку надзявалі на нітку і расцягвалі, прычым утвараўся характэрны гук, зімовых вятроў і мяцеліцы або толькі каляднай завеі. Па інфармацыі мясцовага насельніцтва, гэтыя Дзяды спраўлялі амаль так, як і астатнія. Спецыфічнай абрадавай стравай на іх былі вараныя свіныя ногі [14, с. 55].

[1] Зап. Валодзінай Т.В., Гурскай Ю.А. у 2005 г. ад Міцько В.У., 1926 г. н., у в. Туркі Докшыцкага раёна.
[2] Падрабязны аналіз восеньскіх Дзядоў гл.: Аўсейчык, У.Я. Восеньскія Дзяды ў беларусаў Падзвіння: рэгіянальныя асаблівасці і лакальныя варыянты / У.Я. Аўсейчык // Весн. Полац. дзярж. ун-та. Сер. А. Гуманіт. навукі. – 2012. – № 9. – С. 35–44.
[3] Зап. экспедыцыяй ПДУ у 1996 г. ад Паўлоўскай В.Я., 1926 г. н., у в. Касмыры Чашніцкага раёна.
[4] Зап. Валодзінай Т.В. у 2007 г. ад Ляхновіч В.С., 1928 г. н., Масалковай Р.У., 1936 г. н., Владыка В.І., 1936 г.н., Васкрасенскай Ж., 1938 г. н., у в. Рамашкава Талочынскага раёна.

**Вербныя Дзяды.** У некаторых населеных пунктах Докшыцкага раёна зафіксавана традыцыя спраўлення Дзядоў напярэдадні Вербніцы (мал. 2). У жыхароў дадзенай мясцовасці гэтыя Дзяды лічыліся «поснымі», бо адбываліся ў час Вялікага посту (сямітыднёвы пост напярэдадні Вялікадня). Таму асартымент памінальных страў для абрадавай вячэры быў адпаведным: *«Вясной перад Пасхай за нядзелю Вербныя* [Дзяды – *У. А.*]. *Толькі посная ўсё варылі, з рыбы і з посным маслам»* (в. Краснікі Докшыцкага раёна) [15, р. 12]. На гэтыя Дзяды, як правіла, могілкі не наведвалі [15, р. 23].




Мал. 2. Арэал абраду Вербныя Дзяды на тэрыторыі Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці

На тэрыторыі распаўсюджання дадзенага абраду, а таксама ў некаторых іншых частках Падзвіння, зафіксавана спарадычнае наведванне могілак на Вербніцу [16, арк. 10; 17, арк. 20; 18, с. 77; 15, р. 23]. У некаторых месцах Падзвіння дадзеная традыцыя ўжо не сустракаецца, але пра яе яшчэ памятаюць рэспандэнты: *«Ну гэта раньшай насілі, раньшай і вербачку на кладбішча на первы дзень ішлі і вербачку насілі»*[1].У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя традыцыя наведваць могілкі на Вербніцу і ўторкваць на магілах галінкі вярбы была распаўсюджана ў Віцебскім і Полацкім паветах. Гэта наведванне суправаджалася спецыяльнымі рытуальнымі дзеяннямі (тры разы сцябалі магілу вярбой і прамаўлялі характэрнае прывітанне) [11, с. 16–17]. Наведванне могілак з гэтай мэтай у Віцебскім павеце іншы раз адбывалася на Вялікдзень або Радаўніцу [19, с. 619]. Традыцыя адносіць галінкі вярбы на могілкі на Вербніцу зафіксавана і на Заходнім Палессі [20, с. 51, 52].

**Вялікодна-радаўніцкае памінанне памерлых.** Сярод абрадаў ушанавання продкаў у веснавы перыяд асабліва важнае значэнне мае памінанне памерлых на Вялікдзень і Радаўніцу. Памінанне продкаў, з'яўляючыся неад'емным элементам веснавога сельскагаспадарчага культу ўсходніх славян, увайшло і ў масленічную абраднасць, але на Вялікдзень, асабліва ў наступную за велікодным тыднем, яно дасягнула сваёй кульмінацыі [2, с. 120]. Традыцыя наведвання могілак, прымеркаваная да Вялікадня, зафіксавана нават сярод беларускага каталіцкага насельніцтва рэгіёна [17, арк. 31; 21, арк. 6; 27, арк. 9; 23, арк. 13]. Праваслаўнае беларускае насельніцтва Падзвіння памінае продкаў у першы, радзей у другі, трэці і чацвёрты дні Вялікадня, а таксама на Радаўніцу, якая адзначаецца ў аўторак другога (Фаміногa) тыдня пасля яго. Памінанне памерлых у гэтыя святы (у адно або адначасова ў два) сярод праваслаўнага насельніцтва зафіксавана на ўсёй тэрыторыі Падзвіння.

У рэгіёне распаўсюджана памінанне памерлых на Вялікдзень. Нягледзячы на крайне негатыўнае стаўленне праваслаўнай царквы да памінання памерлых, прымеркаванае да Вялікадня, гэта традыцыя працягвае захоўвацца ў рэгіёне, што дадаткова сведчыць аб яе архаічных вытоках. На большай частцы Падзвіння памінаць памерлых прынята ў першы дзень Вялікадня. У залежнасці ад мясцовасці час памінання ў гэты дзень адрозніваўся. Так, у вёсцы Бабінавічы Лёзненскага раёна могілкі наведвалі адразу пасля ўсяночнай службы ў царкве, не заходзячыся дадому. У вёсцы Сялішча таго ж раёна на могілкі ад-

[1] Зап. аўтарам у 2009 г. ад Кавалевіч З.І., 1936 г. н., у в. Дзедзіна Докшыцкага раёна.

праўляліся ў першы дзень пасля разгавення [7, с. 99]. У вёсцы Баяры Докшыцкага раёна на могілкі ішлі таксама пасля ўсяночнай службы [15, р. 67], а ў вёсцы Дубраўка Докшыцкага раёна – пасля сняданку, у 10–11 гадзін раніцы [15, р. 143]. Падобныя разыходжанні ў часе наведвання могілак сустракаюцца ў розных частках Падзвіння. А як бачна з прыведзеных прыкладаў, яны характэрны нават для невялікіх тэрыторый.

Менш распаўсюджана на Падзвінні традыцыя памінаць памерлых на другі і трэці дзень Вялікадня. Памінанне памерлых у гэтыя дні спарадычна сустракаецца на тэрыторыі ўсяго рэгіёна. Даволі рэдкай для рэгіёна з'яўляецца традыцыя памінаць памерлых у чацвер Велікоднага тыдня, якая распаўсюджана на Палессі і Падняпроўі [24, с. 394; 6, с. 179; 10, с. 123]. У вёсцы Радзюкі Шаркаўшчынскага раёна ў гэты дзень могілкі наведвалі тыя, у каго памерлі родныя на працягу года, *«пасху ім неслі»* [7, с. 99]. Часам памінанне памерлых у гэты дзень не было звязана з наведваннем могілак. У сяле Махірова (сучасны Полацкі раён) памінальныя рытуалы спраўлялі ў чацвер Святога тыдня, які тут называўся «*Наўскім Скрысенні*м». У гэты дзень трэба было зварыць столькі белых яек, колькі ў сям'і было памерлых дзяцей, і з'есці іх на адкрытым месцы, каб дзеці з неба бачылі, што іх памятаюць [25, с. 244]. У сучасны перыяд памінанняў такога характару ў рэгіёне не выяўлена. У паўночнай частцы Падзвіння (Гарадоцкі, частка Верхнядзвінскага, Расонскі раён) памінанне памерлых, прымеркаванае да Вялікадня, не зафіксавана. У некаторых месцах яно нават лічыцца грахом [7, с. 99].

Наведванне могілак на Вялікдзень прадугледжвала «хрыстасаванне» з памерлымі, калі на магілу прыносілі фарбаванае велікоднае яйка, а таксама розныя стравы і гарэлку. На Падзвінні фіксуецца традыцыя, калі пасля пахавання яшчэ не прайшло году, то на магілу носяць не фарбаваныя, а белыя яйкі: *«А на Вялікання на магілкі хадзілі? – Хадзілі, закускі насілі, яйкі. – А якія яйкі? – Крашаныя. А ў каго памершы хто – белыя»*[1]. На Лёзненшчыне (вёскі Сялішча і Бабінавічы) да нашага часу захавалася даволі архаічная традыцыя «качаць» па магіле чырвоным велікодным яйкам [7, с. 99]. Пра існаванне такой асаблівасці ў Віцебскім і Барысаўскім паветах паведамляюць этнаграфічныя крыніцы канца XIX стагоддзя [19, с. 619, 622]. У сучасны перыяд на большай частцы рэгіёна дадзеная традыцыя сустракаецца вельмі рэдка. А выкананне такіх абрадавых дзеянняў для вяскоўцаў іншы раз служыць паказчыкам прыналежнасці да другой лакальнай традыцыі [15, р. 32]. У заходняй частцы рэгіёна на Вялікдзень распаўсюджана традыцыя спраўляць на могілках памінальныя трапезы. У некаторых месцах Докшыччыны такую трапезу ладзілі толькі ў тым выпадку, калі на працягу года ў сям'і быў нябожчык [26, арк. 45; 15, р. 132]. Звяртае на сябе ўвагу традыцыя засцілаць магілу спецыяльным абрусам ці ручніком у час велікоднага наведвання могілак: *«А вот што на кладбішчы? – Прыедзеш на кладбішча, ну як первы год памёр, тады засцелем скацер, закускі берыш і атліваеш, і прыглашаеш усіх саседзяў. – А яйкі ці нясуць на Вялікадня на кладбішча? – Нясуць. Кладуць»*[2]; *«Еслі первая Пасха, і родственнік умер, і первая Пасха, мы бяром і палаценца і пакрываем, і атліваем, і памінаем»*[3].

На Падзвінні распаўсюджана традыцыя памінаць памерлых на Радаўніцу. Пра гэта сведчаць этнаграфічныя крыніцы першай трэці XX стагоддзя і сучасныя палявыя матэрыялы. Шырокае распаўсюджанне ў рэгіёне радаўнічных памінанняў у немалой ступені абумоўлена афіцыйным памінальным статусам свята ў праваслаўнай царкве. У сучасны перыяд на Беларусі яе статус падмацоўваецца заканадаўча (Радаўніца – афіцыйны святочны дзень у краіне). Для ўсходняй і паўночнай частак Падзвіння радаўнічныя памінанні ў веснавы перыяд больш пашыраны, чым велікодныя. Радаўніца з'яўляецца галоўным веснавым памінальным абрадам на ўсёй усходняй частцы Беларусі [20, с. 86; 27, с. 77].

Згодна з традыцыяй наведванне могілак на Радаўніцу адбываецца ў сярэдзіне дня. Сярод беларусаў Падзвіння ў сучасны перыяд яшчэ бытуе прыказка адносна такога часу памінання памерлых: *«З раніцы пашуць, у абед плачуць, увечары пляшуць»*[4]. Для ўсходняй часткі Падзвіння ў гэты дзень характэрна спраўленне рытуальнай трапезы на могілках. Звесткі аб такой трапезе зафіксаваны ў Лёзненскім раёне [7, с. 100]. Памінальныя трапезы на могілках на Радаўніцу амаль адсутнічаюць на захадзе рэгіёна – у Пастаўскім, Мёрскім і Шаркаўшчынскім раёнах [7, с. 100], дзе яны прымеркаваны да Вялікадня. На Радаўніцу зафіксавана традыцыя прыносіць на могілкі велікодныя яйкі [7, с. 100]. Могілкі іншы раз наведваў святар і спраўляў там ліціі (малыя паніхіды) [19, с. 620].

Акрамя абрадавай трапезы на могілках, у этнаграфічных крыніцах спарадычна паведамляецца аб дамашніх памінальных застоллях, уключаных у комплекс абрадавых дзеянняў радаўнічнага памінання памерлых беларусамі Падзвіння. Аб гэтым сведчаць этнаграфічныя крыніцы XIX стагоддзя і су-

---

[1] Зап. аўтарам, Путронкам К., Шыпіла Н. у 2009 г. ад Падбярэзкі Л.М., 1934 г.н, Карніловіч К.І., 1933 г. н., у в. Дзедзіна Докшыцкага раёна.

[2] Зап. аўтарам у 2009 г. ад Плыгаўкі М.І., 1936 г. н., у в. Тумілавічы Докшыцкага раёна.

[3] Зап. экспедыцыяй ПДУ у 2009 ад Мікіневіч Л.М., 1926 г. н., у в. Дзедзіна Докшыцкага раёна.

[4] Зап. экспедыцыяй ПДУ ў 1996 г. ад Шыпулі Н.П., 1934 г. н., у в. Навасёлкі Бешанковіцкага раёна.

часныя матэрыялы. Пра такую памінальную трапезу на Радаўніцу згадваў М. Анімеле (*«снеданне па радзіцелях»*) [45, с. 214]. У Віцебскім павеце дома ладзілі памінальны абед на Радаўніцу, да якога гаспадыня гатавала юшку, клёцкі і куццю [19, с. 619]. У вёсцы Гняздзілава (сучасны Докшыцкі раён) на Радаўніцу па вяртанні дадому *«адбывалі Дзяды»*, як і ў Асяніны [12, с. 259]. На Пастаўшчыне (в. Васіліны) памінальная трапеза на Радаўніцу адбывалася ў хаце пасля наведвання могілак [28, с. 597]. Сучаснае вясковае насельніцтва Падзвіння таксама адзначае існаванне Дзядоў у гэты час: *«Дзяды на Тройцу бываюць, на Радаўніцу»* [15, р. 27]; *«Перад Тройцай Дзяды, перад Радаўніцай Дзяды, Дзядоў многа ёсць, не адны»* [15, р. 46]. У вёсцы Замасточча Докшыцкага раёна па вяртанні з могілак таксама адбывалася трапеза ў хаце, на якой, як і на Дзяды, «адкладалі» памерлым продкам: *«А ў Радаўніцу? – Гэткія сама Дзяды. Ідуць на кладбішча, А тады Дзяды правюць. Прыдзім з кладбішча, адкладаем дзядам»* [15, р. 29]. Аднак такія трапезы іншы раз адрозніваліся ад Дзядоў: «[на Дзяды – *У. А.*] *Стала не ўбіралі, і пакойнікам наліта стопачка. А на Радаўніцу стол убіралі, нічога на стале не астаўлялі»*[1]. Усё ж неабходна адзначыць, што традыцыя спраўляць Дзяды ў гэты перыяд не мае шырокага распаўсюджання. Больш пашыраным спосабам памінання на Вялікдзень і Радаўніцу з'яўляецца наведванне могілак, частаванне памерлых і ў некаторых лакальных варыянтах спраўленне там памінальнай трапезы. Пераважная большасць рэспандэнтаў усё ж не ўпамінае пра дадзеную традыцыю і нават супрацьпастаўляе рытуалы на Вялікдзень і Радаўніцу памінальным урачыстасцям на Дзяды: *«На Радуніцу дык гэта не адносіцца да дзядоў. А Радуніцу ідзеш на кладбішча к сваім пакойнікам. Нясуць, Богу молюцца»* [15, р. 43].

У рэгіёне зафіксавана наяўнасць на могілках у памінальныя дні веснавога перыяду (асабліва на Вялікдзень і Радаўніцу) старцаў (жабракоў). Уяўленне аб старцах-жабраках як медыятарах (пасрэдніках) паміж «гэтым» і «тым» светам (паміж жывымі і памерлымі) [46, с. 459] абумовіла іх уключэнне ў пахавальную і памінальную абраднасць беларусаў Падзвіння. Без жабракоў на Падзвінні не адбываліся ні адно пахаванне, ні адзін памінальны абрад. Традыцыя памінаць памерлых з удзелам старцаў была нават больш распаўсюджанай, чым памінанне ў храме [47, с. 87; 19, с. 507]. Да жабракоў звярталіся з просьбай памаліцца за памерлых, памянуць продкаў. За гэта іх адорвалі ежай, радзей – грашыма: *«Раньшэ хадзіла бабка, каторая ўмела маліцца. І яна вот прыходзіць, каждый от сваей магілачкі, завецьк сваей, сваей і гэдак усё абходзіцца. І яна памалілася, забрала што там ей далі ад этага стала і ўсё»*[2]. Жабракі-жанчыны ўдзельнічалі ў адпяванні і пахаванні памерлых, некаторых з іх нават запрашалі апранаць нябожчыка і сядзець каля яго ноччу [47, с. 97]. Яшчэ ў першай палове ХХ стагоддзя на Падзвінні існавала традыцыя выпякаць да памінальных дзён невялічкія хлябцы (*«курцы»*, *«курчыкі»*) па колькасці памерлых продкаў у сям'і і адорваць імі старцаў [41, арк. 37; 18, с. 77; 48, с. 118]. У другой палове ХХ стагоддзя ў сувязі з паляпшэннем дабрабыту насельніцтва гэтая сацыяльная група са сваёй спецыфічнай субкультурай знікае. У сувязі з гэтым знікае цэлы блок абрадавых дзеянняў і павер'яў, з імі звязаных. На магіле пакідалі таксама ежу і для іншай катэгорыі медыятараў са светам памерлых – птушкам: *«На магіле печэнне, канфеты ілі крупкі какіе пасыпаіш. – А крупкі можа для птіц? – Да. – А пачыму для птіц? – Ну, пцічка – эта штота неплахое, яна как бы памінаіць»*[3].

**Траецкая памінальная абраднасць.** Характэрнай асаблівасцю каляндарнай памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння з'яўляецца траецкі памінальны комплекс. У іншых частках краіны ён не такі распаўсюджаны. У сучасны перыяд памінкі, прымеркаваныя да гэтага свята, пашыраюцца на тэрыторыю ўсёй краіны, паколькі Тройца з'яўляецца афіцыйна дазволеным у праваслаўнай царкве днём памінання памерлых, а субота напярэдадні – адна з «усяленскіх радзіцельскіх субот». Нягледзячы на дадзены фактар, традыцыя спраўляць Дзяды напярэдадні Тройцы не стала такой распаўсюджанай, як траецкія наведванні могілак, і, у пераважнай ступені, захоўвае свой ранейшы арэал. Не маюць распаўсюджання Дзяды ў гэты перыяд на Міншчыне. У рэгіёне яны зафіксаваныя толькі ў некаторых раёнах [8, с. 165]. На Брэсцкім Палессі дадзеная традыцыя таксама не мела распаўсюджання [10, с. 142]. Амаль адсутнічае траецкае памінанне памерлых на Панямонні [9, с. 29]. Траецкія Дзяды спарадычна сустракаюцца на Усходнім Палессі [5, с. 82].

Дзяды ладзяцца ў суботу напярэдадні Тройцы. На Падзвінні існуе традыцыя перад Тройцай упрыгожваць хату *«маем»* – галінкамі дрэў, пераважна бярозавымі [7, с. 111; 15, р. 63, 76]. Напярэдадні траецкіх Дзядоў існавала таксама традыцыя мыцца ў лазні. У вёсцы Слабада Докшыцкага раёна было прынята мыцца ў лазні са «свежым» венікам: «*Ужо Радаўніца жывая ў панядзелак, а мёртвая аўторак. А тады ўжо да Траецкіх Дзядоў няма. Тут ужо свежым венікам з бярозы мыюцца*»[4].

На большай частцы Падзвіння наведванне могілак, прымеркаванае да Тройцы, традыцыйна адбывалася ў суботу напярэдадні свята [19, с. 628]. У Дынабургскім павеце толькі ў выпадку немагчымасці

[1] Зап. Валодзінай Т.В, Гурскай Ю.А. у 2005 г. ад Міцько В.У., 1926 г. н., у в. Туркі Докшыцкага раёна.
[2] Зап. экспедыцыяй ПДУ у 2009 г. ад Карніловіч В.В., 1950 г. н., у в. Дзедзіна Докшыцкага раёна.
[3] Зап. аўтарам, Чараўко В.У. у 2009 г. ад Кудрэц Н.М., 1936 г. н., у в. Луначарскае Верхнядзвінскага раёна.
[4] Зап. у 2006 г. ад Шпет Н.П., 1936 г. н., у в. Слабада Докшыцкага раёна.

наведаць аддаленыя магілы родных рабілі гэта ў тройцын дзень пасля абедні [19, с. 628]. Беларускае насельніцтва Расоншчыны ў сучасны перыяд наведвае могілкі ў першыя тры дні Тройцы [29, с. 544]. Варыятыўнасць, якая сустракаецца ў рэгіёне адносна часу наведвання могілак на Тройцу, у шэрагу выпадкаў абумоўлена часам іх наведвання святаром. Па прычыне немагчымасці аб'ехаць усе могілкі прыходу ў адзін дзень, святар рабіў гэта ў некалькі дзён. У гэтыя дні на могілкі прыходзілі і вяскоўцы. У сувязі з гэтым у вёсцы Тупічына Шумілінскага раёна на могілкі хадзілі на трэці дзень Тройцы [30, с. 205]. У вёсцы Васіліны Пастаўскага раёна па той жа прычыне могілкі наведвалі на трэці дзень Тройцы [28, с. 597].

Як сведчаць этнаграфічныя крыніцы, траецкія памінальныя абрады на могілках мала адрозніваліся ад радаўнічных [19, с. 628]. Асаблівасцю памінання на Тройцу з'яўляецца шырокае выкарыстанне ў рытуальных практыках зеляніны. Да свята імкнуліся ўпрыгожыць «маем» не толькі двары і хаты, але і магілы родных. У Дынабургскім павеце магілы родных прыбіралі не толькі «маем», але яшчэ аерам і кветкамі [19, с. 628]. У вёсцы Янкавічы Расонскага раёна ў час наведвання могілак на Тройцу існавалі даволі характэрныя абрадавыя дзеянні, звязаныя з бярозавымі галінамі: «*Прыходзіш на кладбішча і хрэсціш бярозай магілку, і гэту бярозку ўторкнеш на магілку*» [7, с. 110]. На Верхнядзвіншчыне жанчыны рабілі невялікія бярозавыя венікі і адпраўляліся прыбіраць імі могілкі на Тройцу [31, с. 301]. У вёсцы Сарокі Глыбоцкага раёна традыцыя прыносіць на магілу «май» была характэрна толькі на працягу першага года пасля смерці: «*А ці насілі на Сёмку бярозкі на магільнік? – Насілі, эта ў каго бліжы, тыя і занясуць. У хату насілі і на кладбішча, эта як хто свежа памёр. Яму насілі, а як старшыя магілы, то ўжо не*»[1].

У некаторых месцах Падзвіння на Тройцу ладзілі памінальную трапезу на могілках. Яна фіксуецца пераважна на поўначы рэгіёна, спарадычна сустракаецца і ў іншых яго частках. Для паўночнай часткі Падзвіння характэрнай асаблівасцю траецкага памінання на могілках з'яўляюцца яйкі, пафарбаваныя ў зялёны колер. На Тройцу гэтыя зялёныя «несвянцоныя» яйкі, у адрозненне ад велікодных, не качалі па магіле. Іх з'ядалі пасля малітвы і галашэння, за выключэннем аднаго, якое пакідалі на магіле для бедных [19, с. 628]. У Веліжскім павеце яйкі, пафарбаваныя ў зялёны колер, насілі на могілкі і ў іншыя памінальныя дні (асабліва ў «гадавіну» з дня смерці) [32, с. 222].

Сярод беларускага насельніцтва на Себежчыне зафіксавана традыцыя на Тройцу абмахваць («*опахивать*») магілы бярозавымі галінкамі. Для гэтага ламалі галіны бярозы і «сцябалі» імі магілы. У некаторых месцах Себежскага павета такі звычай называўся «*парыць старыкоў*» [33, с. 90]. Дадзеная традыцыя на Себежчыне захоўваецца і ў сучасны перыяд [34, с. 346].

У этнаграфічнай літаратуры Дзяды, якія спраўляюцца напярэдадні Тройцы, часам сустракаюцца пад называй Стаўроўскія. Згодна з даследаваннямі аўтара і Ю.А. Гурскай абрад Стаўроўскія Дзяды ў сучасны перыяд на Докшыччыне (рэгіён распаўсюджання абраду) прымеркаваны не да Тройцы, а да Узвіжання (14/27.IX) [35, с. 118; 36, с. 76, 87].

Каляндарныя памінанні беларусаў каталіцкага веравызнання ў асноўным прымеркаваны да Дня Задушнага (2.XI). Аднак на Падзвінні зафіксаваны традыцыі памінаць памерлых таксама і ў веснавы перыяд. У католікаў Браслаўшчыны памінкі ладзяць таксама на Зялёныя Свёнткі (Сёмуху) [23, арк. 49; 272, с. 141]. На Пастаўшчыне і Глыбоччыне зафіксавана наведванне могілак на Вялікдзень [17, арк. 31; 21, арк. 6; 22, арк. 9]. Але трэба адзначыць, што ў найбольшай ступені традыцыя ўшанавання продкаў у веснавы перыяд уласцівая менавіта праваслаўнаму насельніцтву рэгіёна. Гэта тлумачыцца наяўнасцю «афіцыйных» (дазволеных царквой) памінальных дзён у структуры праваслаўнага календара, а таксама меншай рэгламентацыяй з боку праваслаўнай царквы.

**Сучасны стан абраднасці.** У структуры сучаснай памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння важнае месца па-ранейшаму займаюць каляндарныя памінкі ў веснавы перыяд. Асабліва гэта тычыцца памінання памерлых продкаў на Вялікдзень і Радаўніцу.

У заходняй і цэнтральнай частках Падзвіння распаўсюджана традыцыя ўшаноўваць памерлых продкаў на Вялікдзень. Неад'емным кампанентам памінальнай абраднасці ў гэты перыяд з'яўляецца наведванне могілак і «хрыстасаванне» з памерлымі, калі на магілу прыносяць велікоднае яйка [38, арк. 7; 16, арк. 19; 17, арк. 16].

Характэрнай рысай сучаснага стану велікоднай памінальнай абраднасці з'яўляецца спрашчэнне і рэдукцыя (знікненне шэрагу элементаў і абрадавых дзеянняў). У першую чаргу гэта тычыцца памінальнай трапезы, якую ладзілі ў час велікоднага наведвання могілак. Некаторыя яе элементы выпадаюць з абрадавых практык беларускага насельніцтва Падзвіння. Нават сама памінальная трапеза паступова знікае. На такую асаблівасць звяртаюць увагу рэспандэнты: «*Раньшэ неяк гэта была, як традыцыя, робілі. А цяпер ужо гэта робяць, еслі перад Пасхай памер родственнік наш, дык на первы дзень*

[1] Зап. Валодзінай Т.В. у 2007 г. ад Талкач А.С., 1933 г. н., Лаўцэвіч А.П., 1937 г. н., Карзевіч К.С., 1922 г. н., у в. Сарокі Глыбоцкага раёна.

*на Пасху, патом накрываюць магілу, і патом ужо там бліжайшыя, хто жэлаець, падходзюць, адліваюць. А цяпер гэта ўжо так. Аджыло гэта»*[1].

У сучасны перыяд на Падзвінні асаблівае распаўсюджанне ў веснавы перыяд набывае памінанне памерлых на Радаўніцу. Такая тэндэнцыя характэрна і для тых тэрыторый, дзе ў мінулым больш пашыраным было велікоднае памінанне. На гэта звяртаюць увагу самі рэспандэнты: «*Цяпер больш на Радаўніцу ходзяць, а раней не хадзілі. Гэта бацюшка ходзіць молiцца»*[2]. Дадзеная сітуацыя абумоўлена некалькімі фактарамі. Па-першае, з 1991 года ў Беларусі Радаўніца з'яўляецца непрацоўным днём. Таму ў гэты дзень памінаць продкаў на могілкі адпраўляюцца многія жыхары краіны, нават незалежна ад канфесіі [21, арк. 19; 39, с. 185]. Разам з тым наведванне могілак на Радаўніцу было ініцыявана праваслаўнай царквой. Памінанне памерлых у гэты дзень заахвочваецца праваслаўнымі святарамі з мэтай прадухіліць наведванне могілак на Вялікдзень. Пра такія захады распавядаюць рэспандэнты: «*Хадзіць перш хадзілі, а цяпер ня ходзім на Вялікання. На первы дзень. А цяпер свяшчэннік сказаў – не, не нада. Раньшы і па яйцу насілі»*[3].

У рэгіёне складваюцца розныя варыянты спалучэння велікодных і радаўнічных памінальных традыцый. У адным выпадку адбываецца своеасаблівы «падзел» памінальных рытуалаў паміж гэтымі святамі. Калі на Вялікдзень ушанаванне памерлых адбываецца ў адпаведнасці з ранейшай традыцыяй, то на Радаўніцу памінанне носіць пераважна царкоўны характар: «*На Радаўніцу ўжо едзем на кладбішча. Бацюшка запіскі чытаець у камніцы ў гэтай, і тады ідзець па ўсім кладбішчы і свінцаець усе магілкі. А яму хто сколькі можа падаець. <...> Цяпер ужо <...> і на Вялікадне не п'юць. А на Радаўніцу дык і саўсем нельзя. Толька бацюшка пасвінцаець, і тады едзеш дамоў*»[4]. У такім выпадку прыярытэт па-ранейшаму аддаецца велікоднаму памінанню памерлых: «*На Вялікадня людзей было, прама на магільніку – ну, цьма. На Радаўніцу ўжо лічаныя прыйдуць, тока ўжо каторыя захочуць пасвінцаць бацюшкам»*[5]. Пра гэта яскрава сведчыць і традыцыя адносіць пафарбаванае яйка менавіта на Вялікдзень, у той час як на Радаўніцу белае [40, арк. 28, арк. 53; 41, арк. 55]. Калі наведванне могілак адбывалася на Вялікдзень, то на Радаўніцу яйка ўвогуле не насілі: «*І ходзяць на Пасху і на Вялікання ходзяць. На Вялікання яйкі носяць, а на Радаўніцу ўжо не носяць*»[6]. На Падзвінні ў сучасны перыяд больш характэрная тэндэнцыя для другога варыянта – «пераносу» часткі (а часам і ўсіх) памінальных рытуалаў з Вялікадня на Радаўніцу [42, арк. 56; 43, арк. 21; 16, арк. 35].

Змены характэрны таксама для радаўнічнай памінальнай абраднасці. У наш час з яе знікаюць асобныя элементы і групы элементаў. У першую чаргу гэта тычыцца абрадавай трапезы на могілках [44, арк. 34]. У значнай ступені такая сітуацыя абумоўлена тым, што радаўнічная памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння знаходзіцца пад пільным кантролем праваслаўнай царквы. А таму на першым плане сярод памінальных абрадаў царкоўныя кампаненты (жалобная служба ў храме, наведванне могілак, асвячэнне магіл святаром).

У сучасны перыяд на Падзвінні пашырана памінанне памерлых на Тройцу. У рэгіёне адбываецца распаўсюджанне памінальных абрадаў у гэты час нават на той тэрыторыі, для якой у мінулым яны не былі характэрны. На такую тэндэнцыю звяртаюць увагу рэспандэнты: «*Я вам скажу. Гэта ціпер на Тройцу ходзяць на кладбішча, прыдумалі. <...> Гэта празнік быў. А на кладбішча ніхто не хадзіў»*[7]. Такая сітуацыя абумоўлена афіцыйным памінальным характарам гэтага свята ў праваслаўнай царкве. У мінулым наведванне могілак пераважна адбывалася ў суботу напярэдадні Тройцы (гл. вышэй). У канцы ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя найбольш пашырана наведванне могілак у тройцын дзень [7, с. 110–111]. У паўночных раёнах Падзвіння наведванне могілак на Тройцу суправаджаецца памінальнай трапезай [7, с. 110]. У гэтай частцы рэгіёна захавалася традыцыя прыносіць на могілкі спецыяльныя яйкі, пафарбаваныя ў зялёны колер: «*Дык спецыяльна яйкі к Тройцэ красілі? – Красілі знаіця чым, бярозавым лісцем. Насабіраеш бярозавага лісця, яны такія зялёненькія тады»*[8].

Такім чынам, аналіз этнаграфічных матэрыялаў ХІХ – пачатку ХХІ стагоддзя дазваляе зрабіць наступныя **высновы:**

1) у комплекс веснавой памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння ўваходзяць Масленічныя Дзяды, траецкія і велікодна-радаўніцкія рытуалы, традыцыі ўшанавання продкаў, прымеркаваныя да Вербніцы;

---

[1] Зап. аўтарам у 2009 г. ад Патэза І.Ф., 1934 г. н., у в. Стараселле Докшыцкага раёна.
[2] Зап. аўтарам, Шыпіла Н., Путронакам К. у 2009 г. ад Карніловіч К.І., 1933 г. н., у в. Дзедзіна Докшыцкага раёна.
[3] Зап. Валодзінай Т.В. у 2007 г. ад Талкач А.С., 1933 г. н., Лаўцэвіч А.П., 1937 г. н., Карзевіч К.С., 1922 г. н., у в. Сарокі Глыбоцкага раёна.
[4] Зап. Філіпенкам У.С., Шаўчэнка Я. у 2009 г. ад Плыгаўкі М.І., 1936 г. н., у в. Тумілавічы Докшыцкага раёна.
[5] Зап. Філіпенкам У.С., Шаўчэнка Я. у 2009 г. ад Плыгаўкі М.І., 1936 г. н., у в. Тумілавічы Докшыцкага раёна.
[6] Зап. аўтарам, Шыпіла Н., Путронакам К. у 2009 г. ад Дранковіч Г.С. 1934 г. н., у в. Тумілавічы Докшыцкага раёна.
[7] Зап. аўтарам, Чараўко В.У. у 2009 г. ад Заяц А.А., 1936 г. н., у в. Шарагі Мёрскага раёна.
[8] Зап. Валодзінай Т.В., Лобачам У.А. у 2009 г. ад Машарскай Л.С., 1922 г. н., у в. Забор'е Расонскага раёна.

2) Масленічныя (Масляныя, Мясаедныя, Буркаўскія) Дзяды распаўсюджаны ва ўсходняй і цэнтральнай частках рэгіёна, а таксама на Докшыччыне. Іх спецыфічнай рысай, у параўнанне з іншымі Дзядамі, з’яўляецца асартымент памінальных страў (бліны, «масленыя» стравы, вараныя свіныя ногі і інш.);

3) на тэрыторыі Докшыцкага раёна існуюць Вербныя Дзяды, адметнасцю якіх быў посны памінальны стол. На Падзвінні спарадычна фіксуецца і традыцыя наведваць могілкі на Вербніцу;

4) у структуры веснавой памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння важнае значэнне маюць абрады ўшанавання продкаў на Вялікдзень і Радаўніцу. У заходняй і цэнтральнай частцы рэгіёна пашырана памінанне на Вялікдзень, а ў паўночнай і цэнтральнай – на Радаўніцу;

5) асаблівасцю каляндарнай абраднасці беларусаў Падзвіння з’яўляецца разгорнуты траецкі памінальны комплекс. Ён уключае Дзяды (дамашняя памінальная трапеза) і абрады ўшанавання продкаў, якія адбываюцца на могілках (у паўночных раёнах суправаджаюцца памінальнай трапезай);

6) памінальныя абрады ў веснавы перыяд на Падзвінні праяўляюць рэгіянальныя асаблівасці. Найбольш яны прасочваюцца ў траецкім памінальным комплексе, велікоднай абраднасці, Масленічных Дзядах;

7) у межах рэгіёна памінальная абраднасць беларусаў у веснавы перыяд мае лакальныя адрозненні, якія характэрны як абрадам, так і асобным абрадавым дзеянням, іх семантыцы, уяўленням і прадпісанням, а таксама праяўляюцца ў назвах абрадаў, часе іх правядзення, наяўнасці ці адсутнасці ў канкрэтнай мясцовасці пэўных структурных частак абраду;

8) для сучаснай каляндарнай абраднасці беларусаў Падзвіння характэрна захаванне асноўных памінальных рытуалаў веснавога цыклу (на Вялікдзень, Радаўніцу, Тройцу, у шэрагу месцаў Масленічных і Вербных Дзядоў). Асабліва важнае месца займаюць памінальныя абрады на Вялікдзень, Радаўніцу і Тройцу. Нягледзячы на захаванне даволі архаічных элементаў у памінальных абрадах, у сучасны перыяд адбываецца іх спрашчэнне і ўніфікацыя, выцясненне народных элементаў царкоўнымі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Ліс, А.С. Структура і семантыка абрадаў. Тыпалогія і паэтыка песень / А.С. Ліс // Каляндарна-абрадавая паэзія; навук. рэд. А.С. Фядосік. – Мінск, 2001. – С. 169–187.
2. Соколова, В.К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов XIX – начало XX в. / В.К. Соколова. – М.: Наука, 1979. – 288 с.
3. Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць / рэдкал.: П.Ф. Глебка [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1967. – 392 с.
4. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко. – Минск: Наука и техника, 1985. – 247 с.
5. Толстая, С.М. Деды в полесском народном календаре / С.М. Толстая // Балто-славянские этнокультурные и археологические древности. Погребальный обряд: тез. докл. / Ин-т славяноведения и балканистики АН СССР; редкол.: Вяч.Вас. Иванов (отв. ред.), Л.Г. Невская. – М., 1985. – С. 81–83.
6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / [ідэя і агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]. – 797 с.
7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / [ідэя і агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка. – 910 с.
8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / [ідэя і агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск: Выш. шк., 2010. – Т. 5: Цэнтральная Беларусь: у 2 кн. / В.І. Басько [і інш.]. – Кн. 1. – 847 с.
9. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / [ідэя і агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск: Выш. шк., 2006. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне: у 2 кн. / В.І. Басько [і інш.]. – Кн. 1. – 608 с.
10. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / [ідэя і агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск: Выш. шк., 2008. – Т. 4: Брэсцкае Палессе: у 2 кн. / В.І. Басько [і інш.]. – Кн. 1. – 559 с.
11. Никифоровский, Н.Я. Освященные предметы и отношение к ним простонародья Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Типо-Литограф. насл. М.Б. Неймана, [1903]. – [2], 26 с.
12. Троицкий, А. Уклад / А. Троицкий // Литов. епарх. ведомости. – 1875. – 27 июля. – С. 69–70.
13. Архіў гісторыка-філалагічнага факультэта УА «ПДУ» (АГФФ). – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 2. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Бешанковіцкі, Чашніцкі і Лепельскі раёны (ліпень 1996 г.). – Сш. 2. Запісы студэнтаў групы 95-Гіс Гаўрылава В., Далгова Д., Сакалова Ю., Яронька В., Зубровай А., Муляронак Н., Кірычык В., Вярцінскай А., Зайцавай А., Змітрачэнка А., Рублеўскай В.
14. Валодзіна, Т. Буркаўкі / Т. Валодзіна // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. – Мінск, 2011. – С. 55.
15. Lietuvių literatūros ir tautosakos instituto Lieuvių tautosakos rankraštynas. – B. 7647. Tautosaka 2006 m. liepos mėnesį prie Neris ištakų surinkta Lietuvos ir Baltarusijos mokslininkų grupės, vadovaujamos Vykinto Vaitkevičiaus.

16. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 4. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў Докшыцкі раён (ліпень 2011 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я.
17. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 5. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Пастаўскі раёны (4–18 ліпеня 2012 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я.
18. Лобач, У.А. Сімвалічны статус і рытуальныя функцыі могілак у беларускай народнай культуры вярхоўяў Бярэзіны і Віліі XX – пач. XXI ст. / У.А. Лобач // Весн. Полац. дзярж. ун-та. Сер. А. Гуманіт. навукі. – 2008. – № 1. – С. 71–82.
19. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: в 3 т. / П.В. Шейн. – СПб.: Тип. имп. акад. наук, 1890. – Т. 1, ч. 2: Бытовая и семейная жизнь белорусов в обрядах и песнях. – XXXIV, 712, [4] с.
20. Агапкина, Т.А. Очерки весенней обрядности Полесья / Т.А. Агапкина // Славянский и балканский фольклор: этнолингвистическое изучение Полесья. – М., 1995. – С. 21–107.
21. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 5. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Пастаўскі раёны (4–18 ліпеня 2012 г.). – Сш. 3. Запісы Аўсейчыка У.Я., Лобача У.А., Малюжанца П., Нікалаевай Г., Краснабаева С.
22. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 8. Палявыя этнаграфічныя запісы Аўсейчыка У.Я. (2005–2011 гг.). – Сш. 7. Матэрыялы этнаграфічнай экспедыцыі у в. Гайдукі Пастаўскага раёна (2008–2009 гг.).
23. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 11. Матэрыялы апытання па тэме: «Пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння» (2012–2013 гг.).
24. Васілевіч, У. Радаўніца / У. Васілевіч, Л. Дучыц, С. Санько // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. – Мінск, 2011. – С. 394–395.
25. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губерн. Типо-Литограф., 1897. – [2], X, 307, 30 с.
26. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 2. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Докшыцкі раён (ліпень 2009 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Лобача У.А., Зянько В., Шаўчэнка Я.
27. Ліцьвінка, В.Д. Святы і абрады беларусаў / В.Д. Ліцьвінка. – 3-е выд. – Мінск: Беларусь, 2001. – 190 с.
28. Гарошка, Т.Г. Народныя святы, абрады, звычаі / Т.Г. Гарошка // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пастаўскага раёна. – Мінск, 2001. – С. 593–599.
29. Сінкевіч, І.Л. Песенная спадчына Расоншчыны / І.Л. Сінкевіч // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Расонскага раёна. – Мінск, 1994. – С. 542–546.
30. Полацкі этнаграфічны зборнік / Полац. дзярж. ун-т; [уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача]. – Навапалацк: ПДУ, 2011. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння. Ч. 2. – 368 с.
31. Крук, І.І. Народныя абрады і звычаі Верхнядзвіншчыны / І.І. Крук // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Верхнядзвінскага раёна: у 2 кн. – Мінск, 2000. – Кн. 2. – С. 292–319.
32. Шлюбскі, А. Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны: у 2 ч. / А. Шлюбскі. – Мінск: Інбелкульт, 1928. – Ч. 2. – 259 с.
33. Серебренников, Ф. Обычаи и обряды крестьян Себежского уезда при крестинах, свадьбе и похоронах / Ф. Серебренников // Памятная книжка Витебской губернии на 1865 г. – СПб., 1865. – С. 75–90.
34. Листова, Т.А. Региональная специфика обрядовой культуры (на примере семейных обрядов) / Т.А. Листова // Белорусско-русское пограничье. Этнологическое исследование; отв. ред. Р.А. Григорьева, М.Ю. Мартынова. – М., 2005. – С. 235–348.
35. Аўсейчык, У.Я. Абрад Стаўроўскія Дзяды на Докшыччыне / У.Я. Аўсейчык // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. прац міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 21–23 красав. 2011 г.: у 2 ч. / Полац. дзярж. ун-т; пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк, 2011. – Ч. 2. – С. 111–123.
36. Гурская, Ю.А. Древние фамилии современного белорусского ареала на славянском и балтийском фоне / Ю.А. Гурская. – Минск: Белорус. гос. пед. ун-т, 2007. – 360 с.
37. Chodorowska, I. Świat żywych i umarłych (możliwości transgresji) / I. Chodorowska // Браслаўскія чытанні: матэрыялы 4-й навук.-краязн. канф., Браслаў, 24–25 красав. / Браслаўскае музейнае аб’яднанне, Браслаўскае краязнаўчае таварыства; рэдкал.: К. Шыдлоўскі [і інш.]. – Браслаў, 1997. – С. 133–145.
38. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 3. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Ушацкі раёны (5–22 ліпеня 2010 г.). – Сш. 3. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Круткіна А., Трацьяковай А.
39. Верещагина, А.В. Праздники и таинства в жизни христиан Беларуси / А.В. Верещагина. – Минск: Белорус. наука, 2009. – 232 с.

40. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 2. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Докшыцкі раён (ліпень 2009 г.). – Сш. 3. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Высоцкага С., Шаўчэнка Я., Шыпіла Н., Путронка К.
41. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 4. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў Докшыцкі раён (ліпень 2011 г.). – Сш. 2. Запісы Аўсейчыка У.Я.
42. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 2. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Докшыцкі раён (ліпень 2009 г.). – Сш. 6. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Радзюка А., Шаўчэнка Я., Высоцкага С., Шыпілы Н., Путронка К.
43. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 3. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Ушацкі раёны (5–22 ліпеня 2010 г.). – Сш. 4. Запісы Аўсейчыка У.Я., Круткіна А., Шумілава Дз., Жахоўскага Б., Салаўёва С., Путронка К., Пятрова І., Траццяковай А.
44. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 3. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Ушацкі раёны (5–22 ліпеня 2010 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Круткіна А.
45. Анимеле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимеле // Этнограф. сб. – 1854. – Вып. II. – С. 111–268.
46. Валодзіна, Т. Старац / Т. Валодзіна, У. Лобач // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. – Мінск, 2011. – С. 459–460.
47. Никифоровский, Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии. Старцы / Н.Я. Никифоровский // Этнографическое обозрение. – 1892. – № 1. – С. 70–105.
48. Аўсейчык, У.Я. Абрад Стаўроўскія Дзяды на Докшыччыне / У.Я. Аўсейчык // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. прац міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 21–23 красав. 2011 г.: у 2 ч. / Полац. дзярж. ун-т; пад агул. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк, 2011. – Ч. 2. – С. 111–123.

*Паступіў 02.06.2014*

## FUNERAL RITES OF PADZVINNE BELARUSSIANS AT SPRING PERIOD (ON THE ETHNORGAPFICAL MATERIALS OF THE 19$^{TH}$ – BEGINNING OF THE 21$^{ST}$ CENTURIES)

***U. AUSEICHYK***

*On the basic of the ethnographical materials of the 19$^{th}$–20$^{th}$ centuries it is devoted the funeral rites of Padzvinne belarussians at spring period. The funeral traditions are analyzed at Maslianitsa and Verbnitsa Dziady, as the rites of consideration of forefathers at Easter, Radaunitsa and Holy Trinity. The characteristic of variants of rites names is given, their areas are determined, the order of ritual actions is considered, the modern position of the rites is characterized, their region particularities and local differences in Padzvinne are exposed. The new field materials are drawn to the ethnological studies, the part of them is fixed by the author. The results of research can be used for the learning of world outlook and religion beliefs as for solutions of problems in the ethnic history of the region.*